**Крыштафовіч, В.** Аб гераізме нават не думалі / В. Крыштафовіч // Пастаўскі край. — 2009. — 14 лют. — С. 3.

## АБ ГЕРАІЗМЕ НАВАТ НЕ ДУМАЛІ

***У многіх з тых, хто прайшоў Афганістан, кадравых ваенных не было ні ў другім, ні нават у трэцім пакаленні. Але і праз дзесяцігоддзі сыноў, бацькоў, дзядоў, аб'яднала адно – вайна. Цяпер тыя; воіны-«афганцы», каму пашчасціла вярнуцца жывымі і здаровымі, самі бацькі дарослых дзяцей, якім ні лакальных, ні глабальных войнаў перажыць не жадаюць. Але перакананы, што вучыцца абараняць Айчыну, яе граніцы – гэта абавязак. Бо толькі моцная армія можа захаваць мір і спакой міралюбівай краіны, якой і з'яўляецца наша Беларусь.***

Для пакалення моладзі, якая вырасла ў Савецкім Саюзе, прафесія афіцэра была даволі прэстыжнай. Пастаўчанін Аляксандр Гарошка таксама вырашыў стаць ваенным і паступіў у Калінінградскае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча. Было гэта ў 1981 годзе. Вучыўся тры гады, накіраванне атрымаў у Закаўказскую ваенную акругу, у Тбілісі. Быў назначаны на пасаду старшага тэхніка рэгламентных работ па радыёэлектронным абсталяванні. Прасцей кажучы, кантраляваў і дабіваўся, каб яно працавала на авіятэхніцы спраўна і строга ў адпаведнасці з устаноўленымі правіламі. Выконваў работы на «аннушках» – самалётах АН-12, 24, 26 і верталётах МІ-8. Паступова прыходзіў практычны вопыт, з'яўлялася ўпэўненасць у сваіх сілах, малады афіцэр узнімаўся па службовай лесвіцы.

Вайна ў Афганістане практычна заканчвалася, ішоў 1987 год, але да вываду савецкіх войскаў заставаліся яшчэ доўгія два гады. Доўгія таму, што там па-ранейшаму ішлі баявыя дзеянні, гінулі нашы ваеннаслужачыя. На іх месца патрабавалася паўнацэнная замена. У ліпені 1987 года адправілі ў Афганістан і Аляксандра Гарошку. Верталётная эскадрылля, якая дыслацыравалася на аэрадроме ў Баграме, прыкрывала транспартныя самалёты. Задача Аляксандра заставалася ранейшай – забяспечваць надзейную работу тэхнікі. Назначылі яго на пасаду начальніка групы рэгламентных работ. Абслугоўвалі ваенныя верталёты МІ-8 і МІ-24. Працаваць даводзілася ў вельмі складаных умовах. Так званай зімой – навокал гразь і вада, а летам – невыносная спёка. Днём тэхніка так награвалася, што да яе нельга было дакрануцца. Стараліся паспець зрабіць неабходнае ранкам, увечары, калі гарачыня крыху спадала. Былі і экстрэмальныя сітуацыі. Напрыклад, падбіты верталёт лётчыкі змаглі пасадзіць, а ім давялося здымаць з яго сакрэтнае ваеннае абсталяванне, калі дэсантнікі ўжо вялі з душманамі бой. Потым верталёт узарвалі.

Па словах Аляксандра, яны бачылі і перажылі пастаянныя абстрэлы. І страх быў, але прытупіўся, бо з вайной звыкліся, яна стала часткай паўсядзённага жыцця. Работы хапала. Латалі, рамантавалі, паялі, наладжвалі, аднаўлялі тэхніку, выконвалі сваю баявую задачу і ноччу, і днём. У яго, ужо старшага лейтэнанта, у падпарадкаванні было 7 чалавек, за якасць работы і жыццё якіх ён адказваў. Ды і не толькі за іх. Аэрадром пастаянна ахоўваўся, таму заступаў дзяжурным па часці, начальнікам каравула.

У лютым 1989-га іх адправілі ў Саюз. Пасля вываду прапанавалі Маскоўскую ваенную акругу. З тэхнікай і абсталяваннем прыбылі на новае месца службы і аказаліся нікому не патрэбнымі – пачалося вялікае скарачэнне. Салдат прынялі, а вось афіцэраў накіравалі ў іх даафганскія

гарнізоны, на ранейшае месца службы. Аляксандру давялося вяртацца ў Тбілісі, а там ужо пачаліся беспарадкі. Заставалася толькі адно: звольніцца і самастойна ўладкоўвацца ў жыцці.

Але на цяжкасці былы воін-«афганец» не скардзіўся ніколі і цяпер не наракае. Працуе вартаўніком у раённым аддзяленні Дэпартамента аховы, добра зарэкамендаваў сябе. Вызначаюць яго дысцыплінаванасць, адказнасць, добрасумленнасць, сціпласць, таварыскасць і надзейнасць. Мае двух сыноў. У недалёкім будучым старэйшага прызавуць на тэрміновую ваенную службу. Юнак стане дастойным прадаўжальнікам сямейных традыцый: бацька ваяваў у Афганістане, дзед прайшоў дарогамі Вялікай Айчыннай вайны, меў узнагароды.

Аляксандр Мікалаевіч Афганістан успамінае часта. А вось з былымі саслужыўцамі сувязь згубілася. Раз’ехаліся хто куды, а потым разваліўся Саюз, было не да перапіскі. Затое з землякамі-«афганцамі» сустракаецца часта. Тую вайну прайшлі вельмі многія пастаўчане, хоць у розныя гады і ў розных месцах. Ім ёсць што ўспомніць, ёсць што прыгадаць, ёсць аб чым пагаварыць і чым падзяліцца.

– Прыемна, – гаворыць Аляксандр Мікалаевіч, – што кожны год нас збіраюць разам, запрашаюць, да помніка воінам-інтэрнацыяналістам ускладаюцца кветкі. У кожнага ў гэты дзень свае ўспаміны, але мы адчуваем сябе разам, успамінаем таварышаў, якія загінулі. А смерць баявых сяброў была для нас самым цяжкім выпрабаваннем. І загінуць мог кожны.

Мінаюць гады, а час не сцірае з памяці тыя падзеі. Былыя воіны-інтэрнацыяналісты не змогуць іх забыць ніколі. Але ні тады, ні цяпер яны не гаварылі і нават не думалі аб «гераізме», «абароне дэмакратычных заваёў» і іншых высокіх матэрыях. Была вайна, і яны яе прайшлі. Каб і сёння заставацца моцнымі.

**В. Крыштафовіч**